ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 64 (446) Пятніца 10 чэрвеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ і НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

У Варшаве забіты паўнамоцны прадстаўнік СССР т. ВОЙКАЎ.

Забойства зьяўляецца простым вынікам подлага цкаваньня, якое вядзецца ангельскім урадам проці СССР

Польскі ўрад таксама адказны за гэтае забойства, учыненае ў яго краі.

МЫ КАТЭГАРЫЧНА ПАТРАБУЕМ ПАДРАБЯЗНАГА РАСЬСЬЛЕДВАНЬНЯ і СУРОВАЕ КАРЫ ЗАБОЙЦАМ

Інфармацыйнае паведамленьне

ВАРШАВА. 7-VI. Раніцою 7-га чэрвеня паўнамоцны прадстаўнік СССР у Варшаве Войкаў, які сустракаў праяжджаўшага праз Варшаву Розэнгольца, паранен на вакзале некалькімі стрэламі.

Паўнамоцны прадстаўнік СССР Войкаў памёр у больніцы яшчэ да апэрацыі. Войкаў мае 4 раны каля сэрца і лёгкіх.

Польскі міністр замежных спраў Залескі прыехаў у пасольства СССР каб выказаць спачуваньне польскага ўраду.

Розэнгольц застаўся ў Варшаве.

Пётр Лазаравіч Войкаў.

(Кароткі жыцьцёпіс)

Пётр Лазаравіч радзіўся ў 1888 г. у Керчы. Пасьля выключэньня з Керчэнскае, а пасьля і з Ялцінскае гімназіі, у зьвязку з палітычнаю „неблаганадзейнасьцю“, яму ўдаецца закончыць сярэднюю адукацыю толькі ў 1905 годзе.

З гімназічнае лавы, яшчэ да расколу партыі ў 1903 годзе, Войкаў пачаў працаваць у падпольнай організацыі РСДРП. Як студэнт ленінградзкага ўнівэрсытэту, ён быў змушаны пакінуць унівэрсытэт і перайсьці на падпольную працу. У 1907 годзе ён прыцягваецца да адказнасьці ваенным судом. Акт абвінавачваньня пагражае карай сьмерці і гэта змушае Войкава ўцякаць з Расіі. За граніцаю Войкаў, не парываючы сувязі з партыяй, заканчвае вышэйшую фізыка-матэматычную асьвету ў жэнеўскім і парыжскім унівэрсытэтах. З першых дзён сусьветнае вайны Войкаў выступае, як праціўнік вайны, і далучаецца да інтэрнацыяналістых, што выклікала прасьсьледваньні з боку эміграцкіх колаў.

У жніўні 1917 году Войкаў уваходзіць у комуністычную партыю. Пасьля Кастрычнікавае рэволюцыі ён займае шэраг адказных пасад і быў, у свой час, намесьнікам наркома замежнага гандлю. У 1917 годзе Войкаў пераходзіць на працу ў Нар. Кам. Замежных Спраў і 10-га кастрычніка 1924 году назначаецца паўнамоцным прадстаўнікам у Польшчу.

Войкаў быў выдатным матэматыкам. Калі ён быў у Жэневе, прафэсары жэнеўскага ўнівэрсытэту, дзе ён вучыўся, праракавалі яму сусьветную вядомасьць у гэтай галіне.

Нота протэсту т. Літвінава польскаму ўраду.

Саюзны ўрад ставіць гэты нячуваны ўчынак у сувязь з цэлым шэрагам актаў, пакіраваных да зьнішчэньня дыплёматычнага прадстаўніцтва СССР па-за межамі і пагражаючых міру. Наскокі на пекінскае пасольства СССР, засада консульства ў Шанхаі, паліцэйскі напад на гандлёвую дэлегацыю ў Лёндане, правакацыйны разрыў дыплёматычных зносін з боку Англіі,—увесь гэты шэраг актаў разьвязаў дзейнасьць тэрарыстычных груп рэакцыянэраў, якія ў сваёй бязмоцнай і сьляпой агіднасьці да рабочае клясы, хапаюцца за аружжа палітычных забойстваў.

Саюзны ўрад бачыць у забойстве свайго пасланьніка таксама і вынік таго, што польскі ўрад ня прыняў неабходных мер супроць злачыннай дзейнасьці на тэрыторыі Польшчы расейскіх контр-рэволюцыйных тэрарыстычных організацый, асабліва небясьпечных для справы міру ў сучасных напружаных міжнародных абставінах.

Заяўляючы па гэтаму свой рашучы, негадуючы протэст і лічачы, што польскі ўрад ня можа ўхіліцца ад адказнасьці за здарэньне, Саюзны ўрад застаўляе за сабою права вярнуцца да пытаньня па атрыманьні больш падрабязговых і вычэрпваючых вестак аб зробленым у Варшаве злачынстве.

Падрабязнасьці забойства т. Войкава

Утворанае ўскрыцьцё цела Войкава выявіла дзьве паважныя раны, з якіх адна зьявілася сьмяртэльнай. Куля прабіла рабро і лёгкае. Войкаў памёр ад нутранога зьліяньня крыві. Цела т. Войкава ў 7 гадзін увечары перанесена ў пасольства.

—

Розэнгольц паведаміў корэспондэнту ТАСС наступныя падрабязнасьці забойства: у 9 гадзін раніцою Войкаў сустрэў Розэнгольца на пэроне пры выхадзе з вагону. Войкаў прыехаў на вакзал у саправаджэньні загадчыка гаспадарчай часткі Грыгаровіча, якога потым адпусьціў. Розэнгольц і Войкаў пашлі ў буфэт піць кофэ. Вышаўшы з буфэту, Войкаў пашоў на пэрон і паказаў Розэнгольцу аўтамабіль, якім сам кіраваў. Абодва зьвярнуліся на пэрон у 9 гадзін 40 хвілін. Да адходу цягніка заставалася 15 хвілін.

На пэроне Войкаў і Розэнгольц ажыўлена гутарылі. Раптам раздаўся вельмі блізка выстрэл. Розэнгольц у першую хвіліну ня думаў, што страляюць у іх. Войкаў адбег назад. Страляўшы кінуўся за ім і зрабіў некалькі выстралаў. Войкаў выхапіў рэвольвэр і некалькі разоў стрэліў, пасьля чаго ўпаў. Забойца адбег на процілеглы бок і ўзяўшы рэвольвэр за ствол, добраахвотна здаўся паліцыі.

Забойца арыштаваны паліцыяй, аказаўся Барысам Кавердой, гімназістым апошняй клясы Віленскай гімназіі, 20 год.

У консульскім аддзеле поўнамоцнага прадстаўніцтва корэспондэнту ТАСС паведамілі, што Каверда прыходзіў у консульства прасіць дазволу на ўезд у СССР.

Пры забойцы знойдзены запоўненыя анкеты консульскага аддзелу, памечаныя 31 мая. Згодна анкеце, Барыс Сыпронавіч Каверда радзіўся ў сяле Янышкі, Віленскага павету, у 1907 годзе. Каверда,—польскі падданы. З СССР ён выехаў у 1920 годзе, у якасьці бежанца. У поўнамоцным прадстаўніцтве корэспондэнту ТАСС паведамілі, што тэлеграма, паведамляючая аб праезьдзе Розэнгольца сёньня раніцаю праз Варшаву, была атрымана поўнамоцным прадстаўніцтвам 6-га чэрвеня ў 10 гадзін увечары. Ніхто, акрамя некалькіх адказных супрацоўнікаў поўнамоцнага прадстаўніцтва, аб гэтым ня ведаў. У газэтах таксама ня было ніякіх паведамленьняў аб тым, што Розэнгольц будзе праяжджаць і што будуць яго сустракаць на вакзале.

—

У сувязі з забойствам Войкава, вышлі экстраныя выпускі газэт. Афіцыёзная газэта «Эпока» піша: «Злачынца — расейскі манархісты. Злачынства, утворанае расейскім эмігрантам, злоўжыў сваім правам гасьцінасьці ў Польшчы, выклікае агульнае абурэньне і протэст усяе грамадзкае думкі. Мы выказваем свае глыбокае спачуваньне пасольству СССР, галава якога лёг ахвярай абураючага злачынства.

Савет Народных Камісараў БССР, заслухаўшы на сваім пасяджэньні паведамленьне аб забойстве расійскім белагвардзейцам-манархістым у Варшаве 7 чэрвеня паўнамоцнага прадстаўніка Саюзу ССР у Польшчы

т. ВОЙКАВА Пятра Лазаравіча

пры выкананьні ім службовых абавязкаў, выказвае ад імя рабочых і сялян БССР глыбокі жаль з прычыны вялізарнае страты аднаго з найлепшых барацьбітоў за справу соцыялізму.

Савет Народных Камісараў БССР.

АДКАЗ ЧЫРВОНЫХ ТЫСЯЧ

Дэмонстрацыя менскага пролетарыяту.

У той вечар...

Увечары 7-га чэрвеня, як і заўсёды, прагучэлі гудкі. Як і заўсёды, вуліцы былі паўны народам—гуляючай моладзьдзю, рабочымі, зьвяртаючыміся з прадпрыемстваў, чырвонаармейцамі....

Яшчэ амаль ніхто ня ведаў...

А ў гэты час у Варшаве, на бальнічнай койцы паміраў ад здрадніцкіх куль белагвардзейскага ўблюдка наш паўнамоцны прадстаўнік у Польшчы **тав. Войкаў.**

Але раптам жудасная вестка абляцела вуліцы. Быццам-бы тыя кулі, якія пранзілі грудзі **тав. Войкава**, зажужалі над вячэрнім горадам, напоўнілі яго трывогай...

— Забілі... Забілі... Сволачы! Што-ж далей?

— Вытрымка, таварыш, вытрымка! Нам гэта не ўпяршыню!

На пасяджэньні бюро комсамольскай ячэйкі працасьветы ў гэты вечар нечакана зьявіўся сэкратар ЦК КП(б)Б **тав. Кнорын.**

— Таварышы--сказаў ён--я выпадкова трапіў на ваша пасяджэньне... Дазвольце мне зрабіць маленькую інформацыю...

І тав. **Кнорын** расказаў комсамольцам аб забойстве у Варшаве **тав. Войкава.**

— Мы не павінны адказаць маўчанкай на гэты провакацыйны акт з боку ашалеўшай зграі консэрватараў!

Адкажам на забойства дэмонстрацыяй протэсту, якая была-б чутна далёка за нашымі межамі у Варшаве і Лёндане!

... А горад гудзеў...

На плошчу!

— На плошчу, таварышы, на плошчу!

Станкі сталі. Паскіданы халаты. Шырока расчыніліся фабрычныя вароты.

— На пло-о-о-шчу!

Высыпалі. Сьцягі, толькі што намалёваныя лёзунгі, чырвоныя хусткі ў руках...

Хутчэй!

Тысяча, дзьве, тры... Дзесяць...

... Пятнаццаць...

І над усім гэтым чырвона-сінім жывым акіянам—суровыя словы **рабочага МББ чыгункі тав. Івалінскага:**

— Мы сюды прышлі сказаць свае рэзкае слова па поваду забойства т. Войкава. Гэта забойства зьяўляецца працягам тэй політыкі, якую вядзе ангельскі консэрватыўны ўрад... Нас хочуць выклікаць на вайну... Мы вайны не жадаем, але калі гэта патрэбна будзе, мы зможам даць належны адпор... Мы з молатам у аднэй руцэ і вінтоўкай у другой, заўсёды гатовы да адпору.

—Няхай жыве рабочая кляса Польшчы і яе авангард—комуністычная партыя!...

На бальконе, сустрэчаны раскатамі «ўра», **прадстаўнік Выканкому Комінтэрну тав. Пятроўскі.** Ён кажа:

— Таварышы! У Варшаве адбылося новае нячуванае злачынства--забіт тав. Войкаў. Мы не дазволім паўтарэньня швэйцарскай камэдыі... Мы патрабуем адказу ад польскага ўраду...

Капіталістыя адчуваюць, што справа іх праіграна. Яны ненавідзяць СССР—першую краіну працоўных і жадаюць яе спаліць у полымі вайны. Але рабочыя чужаземных краін гэтага не дапусьцяць! Я сам быў сьведкай многіх дэмонстрацый рабочых Лёндану, на якіх адно слова «СССР» выклікала вялічэзнае захапленьне і радасьць... Рабочыя ўсяго сьвету ведаюць, што вайна супроць СССР ёсьць вайна супроць іх саміх... Яны яе не дапусьцяць!

Мы жадаем пабудаваць соцыялістычную граmаду працоўных, дзе людзі вольна карысталіся-б плёнам сваёй працы. Капіталісты зьбіраюцца нам перашкодзіць.

Дык няхай-ж яны ведаюць, што калі патрэбна будзе, Кастрычнік... той вялікі Кастрычнік, які ўзрушыў увесь сьвет, запаліць вялікі пажар усясьветнай рэволюцыі.

Тав. Пятроўскі скончыў... Гукі аркестраў.

З бальконy гаворыць генэральны сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын.

— Таварышы, мы сышліся сюды, бо нашаму мірнаму будаўніцтву пагражае небясьпека вайны. Нас не задаволяць прылізаныя дыплёматычныя манэўры польскага ўраду, які думае ад грозных праяў адчапіцца абменам візітных картак.

Мы жадаем міру. Але побач з гэтым, мы будзем на варце, будзем штодзённа ўзмацняць нашу Чырвоную армію...

На мітынгу яшчэ выступалі т. т. Перапечка, Гельтман, Бронштэйн, Голадзед, Чарвякоў і інш.

Мітынг прашоў з вялікім ўздымам

Ганьба міравым катам!

Голас 15-ці тысяч менскіх пролетарыяў

Забойства тав. Войкава сярод белага дню ў сталіцы Польшчы—адно з зьвеньняў ў ланцугу правакацыі: налёты на нашы гандлёвыя прадстаўніцтвы ў Пекіне, Шанхаі, гандлёвае прадстаўніцтва ў Лёндане, разрыў дыплёматычных зносін і г. д.

Мы зьвяртаемся да працоўных ўсяго сьвету з прызывам абуздаць зарваўшыхся бандытаў.

Імпэрыялісты імкнуцца ўнесьці замяшаньне ў нашы шэрагі і сарваць наша мірнае будаўніцтва.

У адказ на гэта працоўныя чырвонай сталіцы Беларусі--Менску заяўляюць ангельскім лёрдам і польскім фашыстым ня ўдасца зноў надзець на нас ярмо капіталізму.

На месца аднаго байца тав. Войкава, стануць новыя міліённыя кадры байцоў.

Урад саветаў не адзін раз зьвяртаў ўвагу польскага ўраду на факт існаваньня і дзейнасьці на яго абшару белагвардзейскіх манархічных організацый. На польскі урад ускладаецца пагэтаму адказнасьць за новую афяру, ён не прыняў неабходных мер для папярэджаньня злачыннай дзейнасьці контр-рэволюцыйных тэрорыстычных організацый белагвардзейшчыны. Мы патрабуем ад нашага ураду прыняць ўсе меры к утварэньню неабходных умоў для працы нашых прадстаўнікоў за мяжой.

Час палажыць канец здрадніцкім нападам на нашых барцоў!

Мы кажам міравым драпежнікам: хто сее вецер, пажне буру. Чаша цярпеньня пролетарыяту перапоўнена.

Мы за мір! Але калі патрэбна будзе, ўсе, як адзін, заменім молат на вінтоўку.

Вечная памяць паўшым барацьбітам!

Ганьба міравым катам!

Няхай жывуць працоўныя Польшчы і іх авангард—Комуністычная Партыя Польшчы!

Няхай жыве штаб міравой рэволюцыі---Комуністычны Інтэрнацыянал!

Чатыры гады вандраваньня па лесу бюрократызму

Як пачалося?

Яшчэ у 1923 годзе, 25-га сакавіка ў Забаўскага ўкралі малатарню каштоўнасьцю ў 225 пудоў хлеба. Была заразжа паведамлена аб гэтым міліцыя, якая пачала расьсьледваньне. Па цэламу шэрагу рэчавых даказацельстваў у кражы быў западазрон сусед Забаўскага Дзяргач Федар, які тут-жа быў арыштаваны. Дзяргач жыў перапраўлены ў горад Бабруйск. Здаволены Забаўскі штодзённа чакаў звароту малатарні Дзяргачом.

Чакаў, чакаў і нарэшце дачакаўся. Роўна праз шэсьць дзён зьвярнуўся... Дзяргач у вёску.

Забаўскі ў той-жа дзень пашоў зьдзіўлена ў міліцыю даведацца аб прычынах аслабаненьня Дзяргача. Там ён атрымаў адказ начальніка міліцыі «ня ведаю».

Праз чатыры дні Забаўскі зноў пашоў да начальніка міліцыі за даведкай. Начальнік міліцыі Барсаў у выдачы даведкі адмовіў, нават хацеў арыштаваць Забаўскага за «прыставаньне» і толькі пасьля пагроз Забаўскага, што ён будзе скардзіцца ў акругу, адпусьціў яго.

На заўтра Забаўскі пашоў у Бабруйск да сьледаваценя, які адказаў, што справа накіравана ў Нарсуд 1-га вучастку Бабруйскай акругі

Сэкратар гэтага суду, да якога зьвярнуўся Забаўскі, са злосьцю адказаў «Пасьпееш. Нам трэба судзіць тых, якія ў турме сядзяць». Забаўскі, пачакаўшы 2 месяцы зноў пашоў да сэкратара суда. Тут ён атрымаў такі-ж адказ. Гэта было ў чэрвені месяцы. У Кастрычніку Забаўскі, зьявіўшыся да сэкратара суду, быў ашаломлены атрыманым адказам. У судзе яму сказалі, што 17-га жніўня была амністыя, па якой Дзяргач лічыцца апраўданым.

— А малатарня, закрычаў усхваляваны Забаўскі, мусіць амністыя зьвярне мне яе.

Судзьдзя халоднакроўна яму адказаў: «падавай грамадзянскі іск».

Забаўскі падаў іск і ўрэшце 18-га студзеня 1924 году ў Бабруйску адбыўся суд. Дзяргача прысудзілі да выплаты Забаўскаму 225 пудоў хлеба за малатарню.

Але кароткай была яго радасьць. Дзяргач падаў касацыю ў акруговы суд, і зноў пацяклі дні поўныя мытарства і пазбаўленьняў.

Зноў у бюрократычным віру

Забаўскі атрымаў павестку ад акрсуду, што 18-га красавіка 1924 году ён павінен зьявіцца ў суд, дзе будзе разглядацца яго справа.

18-е красавіка... Зьявіўся... Чуць ня цэлы дзень чакаў у калідорах памяшканьня суду. Як раптам вышаў сакратар і заявіў, што справа Забаўскага сёньня разглядацца ня будзе.—«Прыедзеце праз два тыдні».

Прашло ня два тыдні, а калі трох месяцаў, а абвесткі ўсё ня было. Забаўскі цягнецца ў Бабруйск да пракурора. Той паслаў яго з запіскай у суд. І вось суд—24-га чэрвеня. Да суду Дзяргач энэргічна рыхтаваўся і ў горад езьдзіў некалькі разоў, здабыў абаронцу. Ён багач. У выніку Дзяргач апраўданы.

Абураны Забаўскі падае касацыю ў Вышэйшы суд. Тут справа зусім не разглядалася і быццам-бы заглохла. У Вышэйшы суд Забаўскі касацыю перадаваў праз акруговы суд.

Пасьля гэтага ён некалькі разоў даведваўся дзе знаходзіцца справа. У Бабруйску яму адказалі, што справа прапала. Пашоў да пракурору са скаргай. Гэта было ўжо ў маі 1926 году. Пракурор сказаў, што будзе знойдзена. Але праз некаторы час пракурор зноў зьявіўшамуся да яго Забаўскаму сказаў, што з прычыны частай зьмены служачых, справа сапраўды прапала.

Апошняя патуга

Над Забаўскім цяпер уся вёска сьмяецца. Уся вёска ведае добра, што Дзяргач украў малатарню і чамусьці астаўся чыстым.

Справа перададзена цяпер прокурору рэспублікі. І зноў ідзе перапіска, расьсьледваньне. Ужо 1927 год. Чэрвень месяц... «А воз и ныне там».

Лісты са згубленага портфэлю

У вагоне прыгарадных чыгуначных шляхоў раскіданы чалавек згубіў портфэль.

Портфэль быў знойдзен...

Акрамя дакумантаў, якія кажуць аб тым, што ўладар портфэлю захапляецца спортам, што ён зьяўляецца студэнтам-комсамольцам, у портфэлі аказаўся шэраг лістоў, якія захоўваліся іх уладаром у працягу двух год.

Лісты гэтыя былі дастаўлены ў рэдакцыю Маскоўскай газэты «Молодой Ленинец». Аўтары гэтых лістоў— комсамольцы, яго былыя таварышы па школе 2-й ступені, якія яе скончылі некалькі гадоў таму назад. Іх узрост: 20—21—22 гады.

Аўтары лістоў жывуць у горадзе Арэхава-Зуеве. Яны зьвязаны з вытворчасьцю і актыўна працуюць у комсамоле. Двое з іх--Зьмітрок Плешакоў і Іван Тарасаў вырасьлі да гэтых пор і жывуць у рабочых казармах. Трэці, чые лісты ідуць за подпісамі «Алёха», «Лёха» (Аляксей Гурын)--былы ўкомаўскі працаўнік, які імкнуўся пастуціць у літаратурна-мастацкі інстытут.

У прыведзеных лістох, ня гледзячы на тое, што іх аўтары прымаюць актыўны ўдзел у комсамольскай і грамадзкай працы, няма ніводнага радка, прысьвечанага грамадзка-палітычным пытаньням. Кожны ліст, кожны радок дыша разьвязанасьцю падрастаючых цынікаў і пашлякоў.

Аднэй з ілюстрацый мяшчанскай разьвязанасьці служыць расьпіска знойдзеная ў портфэлі і друкуемая ў газэце.

Мы ніжэй зьмяшчаем гэтыя лісты, апускаючы шмат вульгарных падрабязговасьцяй.

Зварочваючы ўвагу нашых чытачоў на гэтую пошласьць і цынічнасьць, якімі насычаны радкі лістоў, мы падкрэсьліваем, што прыведзеныя факты ні ў якай меры ня могуць служыць для фантазыі пісьменьнікаў Малашкіных: Раманавых і Гумілевых.

Гэтыя лісты характарызуюць толькі нязначную праслойку моладзі, у якіх пахабныя адносіны да дзяўчыны, выклікаНы лёгкадумнасьцю, канчаюцца голым цынізмам і подласьцю.

Выцягваючы на паказ гэтыя факты, расчыняючы іх перад нашай грамадзкасьцю, мы не захоўваем недахопаў нашага быту, асабістага жыцьця і дзякуючы гэтаму ствараем магчымасьць да зьнішчэньня іх.

Здарова, братва!

Васька! Памятаеш, прывітаньне прасіў перадаць?

Я прыехаў, Варка прышла. Скінуў мяшок і кажу:

— Прывітаньне табе!

Не зразумела і пачырванела.

— Сур'ёзна, табе прывітаньне.

— Ад каго?

— Ад Васі Хазава.

— А-а-а.

Вось так і ўскрыкнула, як быццам на ногу ёй зьлягка наступілі. На мазоль, значыць.

Раю табе: пішы ты ёй пісьмішка такоўскае, палкае:

...Прывітаньне табе, кветка палявая, лясная русалка, краса і гордасьць Арэхава (значыць, з майго і Васькінага пункту погляду) і г. д. О, як я кахаю цябе! Няма слоў, іх не дало чалавецтва і ня дасьць, каб апісаць каханьне маё.

Але ў кароткіх рысах тлумачу табе, калі-б ты сказала: калі кахаеш мяне аддай усё, што ёсьць у цябе. Я-б аддаў усё да анучак выблючна і голым бы да цябе зьявіўся, каханьне мае...

А калі ў Арэхава прыдзеш, прызнайся ў каханьні ёй і, галоўнае, больш, больш хлусі...

Я зараз працую ліквідатарам няпісьменнасьці. Адным словам, Грамчака. Рабочых гадзін у тыдзень з двух груп—12. Астатні вольны. Пэнсія—40 руб. Выгада простая. А з укому вышаў.

Што вы нічога ня пішаце? Адрас цяперача: Арэхава-Зуева, Зімінская паласа, 284.

А. Г. (Асабіста)

Студэнтам другога курсу

«Будучым валасным тэхнікам зямлімерам мае сардэчнае наважаньне і паздраўленьне з наступаючай вясною. Добра вясною гэтак з бабай пойдзеш у лясочак, так салаўі пяюць, пахне кветкамі, навокал так прыгожа, што ня хочаш, ды лапнеш такую пекную, грудастую. Ды, што гэта я расьпісваю, а не адракамендуюся. Маю гонар прадставіцца: адстаўны ротмістр Ванька Тарасаў з Арэхава. Ведаеце такога? А з кім маю гонар гутарыць?

Студэнты другога курсу!!

Вася і Жэнічка (зямлі--меры). Вельмі прыемна, ну, як жывеце. Вы б.. запэмя; талі пра мяне зусім, зазналіся. Мы, маўляў, шыбка пісьменныя з-я-м-л-і-м-е-р-ы!!! У нас, значыць, у галаве матэматычныя вылічэньні і землякарыстаньне на новых пачатках. Што з нявучонымі дарма час траціць! Ну, кіньце, сябры, досыць з-за пусьцякоў сябрэўства губляць.

Ты Васька, мабыць «галадуеш»? Прыяжджай, устроім.

Ты, сволач, любіш выпіць. Памятаеш, я быў крыху выпіўшы, спаткаў вас з Міцькай ля першай казармы ў дрызіну п'яных, ты быццам бляваў. Хлапец моцны, усё пройдзе. Ды, гэта было апошняе спатканьне. Я спадзяюся, што ў хуткім часе мы зьбярэм другі зьезд нашага «патаемнага таварыства», падагулім за год прадуманае і вызначым плян далейшай працы. Пішэце абавязкова адказ, а то, праўда, сумна і пажалуй ажанюся. Вазьму бабу здаровую, якую, калі прыедзеце, на зьезьдзе, пажыже разбавім, на ўсіх хопіць. Ну, добра. Чакаю адказу.

Пішэце па адрасу Арэхава-Зуева, Крутое, каз. 131/7, пакой 96 Тарасаву».

Добры дзень, сябры!

Аб чым пісаць¿

Вось адна дзяўчына на рамантычнай глебе рашыла пакончыць з сабою і выпіла воцату (ну, дзе-ж нам «ляворвэрты» мець ..), так, выпіла, значыць і працягнула ногі ўздоўж усёй падлогі. Народу цьма зьбеглася. На грудзі яе пісільку знашлі. А ў пісульцы тэй вельмі жаласна прапісана: «Прашчавай, Ванька...». Дзеўка гэта, вядома, не памерла. У нас народ жывучы... Проста ўздумалася ёй воцату ў горла пусьціць і зрабіла, як дзядзька Сыпрон, «які міма кубка з гаэю прашоў, і тую выпіў». Усё гэта вельмі звычайна, у парадку рэчаў і дзівіцца тут няму чаму...

> **РАСЬПІСКА**
>
> Даю чеснае ленінскае слова: усё тое, што сказана В. Х. і Е. Х. мне, нікому не казаць і гарантую гэтае чэснае слова тым, што ў выпадку калі я прабалтаюся,—плачу ім адзін чырвонец.
>
> Подпісь (неразборчывы).

Да рэчы, яшчэ паведамляю некалькі маленькіх фактаў, як напрыклад:

«Усім грамадзянам, маючым сабак, прапануецца апошніх-безадкладна зарэгістраваць. Незарэгістраваныя сабакі будуць зьнішчацца».

І шмат ёсьць драбнейшых фактаў, незаслугоўваючых асаблівай увагі. Вучуся на курсах (раней «рак сьвісьне» ці «певень кабыле ногу адцісьне», чым мы кончым вучыцца).

Вечарамі напяваю песенькі.

Наогул прыяжджай, у нас весела... «Жывем прахладна, ні храна няма, і ладна».

Пішы часьцей лісты. Я таксама пачну пісаць табе рэгулярна...

Пішы!

У ўкоме я не працую. Зараз па вуліцах пыл паднімаю... Усяго добрага!

Алёха.

Здароў, Вася!

Ліст ад цябе атрымаў, але выбачай за тое, што не пасьпешаўся напісаць табе затым што ён быў атрыманы без мяне і яго чуць ня згубілі. Ты пішаш мне, як жывеш і дзе знаходзіцца твая рэзідэнцыя, аб сваёй пэратасоўцы і аб тым, што нявесела там табе жыць. У сваю чаргу не магу табе растлумачыць усяго гэтага, але для мяне асабіста наадварот, затым што для мяне ніякага «ідэалу жыцьця» няма. Калі сур'ёзна «заняцца», дык яны нічога карыснага не даюць, акрамя няволі, калі-ж так сабе, праўда весела і неяк крапчэй адчуваеш сябе, і так ты памыляешся, Прашу цябе, імі вельмі не захапляцца. Паведамляюць табе, што меў шчасьце быць у іх на вечарынцы. Не падумай, што шчасьце ў іх. Не! Наогул. На якой дагаварыўся з Н. Ю. пагаварыць і праводзіць яе, яна дае сваю згоду. Усё гэта адбывалася на хаду ў часе ігры вальсу. Сваёй нечаканай прапановай і ўводжу яе ў непакой з нецярпеньнем чакаю канца вечарынкі.

Што датычыць яе непарушнасьці дык нічога казаць ня буду і настойваць таксама. Папершае, мы ня ведаем ці была яна непарушна да яго, гэта нас покуль што?... Мяне асабіста заманьвае, гэта пекната дзяўчыны і гэта, у будучым ідэяльная маці, добрая гаспадыня і каханая жынка. Калі, як належыць яе спазнаць і разглядзець, дык што-ж у ёй добрага, гэта значыць асаблівага? Такіх для нас яшчэ ого-го, шмат. Наш саюз вялікі і такога хламу многа, так што хлапцам тужыць ня прыходзіцца, толькі да іх патрэбен асаблівы, але просты падыход. Я ня ведаю, аб чым ты тужыш... Наша жыцьцё яшчэ ўперадзе. Як бачыш, я прышоў да такога выкаду, прашу і цябе аб гэтым лепш і сурь'ёзьней падумаць. І так, я аб гэтым канчаю. Цяпер што колечы аб сваім жыцьці. Працую ў электрыч. рамонт. атб. Кр. ф-кі. Час праходзіць вельмі весела. Разьвёў ад няма чаго рабіць знаёмства з сымпатычнымі і вясёлымі дзетачкамі гадоў 15-16, але гэтаму я асаблівага значэньня не прыдаю, тым, чым мы асабліва прагнем вясною, гэта ўсе буза, да гэтага трэба падыходзіць асьцярожней і разумней.

Пішы, будзь адкрытым, мы з табою што небудзь зладзім. Да пабачэньня.

Застаюся твой сябра Д. П.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВА-ЦЕЛЮ ЗЯМЛІ РУСКАЙ

— Прывітаньне ад сусьветнага пролетарыяту, працаўніку зямлі і лесу—шчырае прывітаньне ад дапрызыўніка Арэхава-Зуева. Ур-ра! (музыка грае туш. Бурныя воплескі, пераходзячыя ў авацыі. Усе ўстаюць).

І так, здрасьце Васіль Сакавіч!

Вы, значыць, нарыс атрымалі. Вельмі прыемна!

Учора да мяне заходзіў Ванька. На тарпараспрацоўках працаваць кончыў. Кажа, што нядрэнна. Пабаўтаў з тарпянічкамі (яны народ палкі і просты, цемнатою іх карыстаўся). Зараз часова працую ў бальніцы ля 3-й будкі. А потым пойдзе катаваць у Мастоп (маставыя тапгаць). У тэхнікум не паехаў. Хоча зімою заняцца па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Жыву, як і раней. Жывем прахладна, ні храна няма—і ладна. Як у рамансе пяецца—«тяжела, безотрадна жизнь»—таму, што няма працы, якая цябе цікавіць, якой-бы ты аддаўся ўвесь. Нам з табою гэта зразумела. Добра,—зразумела. Памятаеш, гаварылі за шклянкай трохгорнага.

Чытаў крыху Есеніна...

Напішы ліст Клаўдзе. Яна мне штосьці казала. Я не зразумеў. Напішы абавязкова.

Лёха.

Васілю Сакавічу шчырае прывітаньне!

Вучуся на курсах. Шмат працы... Вучоба паядае ўвесь час...

На курсах дзяўчаты—пекната...

Грудзі—лебядзіныя...

Губкі—кавуновая салодкасьць... Так многія, а больш усіх адна—яна. На курсах з гэтай прычыны вучыцца—прыемна і з таго і з другога боку. Вучоба—захоплівае, перастаеш цікавіцца тэатрам і г. д.

Вечерамі—дахаты ідзём вялікай **двухполай** кампаніяй... Жарты...

Спадзяюся, што вы прыедзеце на каляды. У нас, магчыма, адчыняць лыжную станцыю, горы. Зьбярэм дзяўчат.

Зіма... Белы дыван сьнягоў. Ядропая сьвежасьць...

З дзяўчатамі—добра.

Прыяжджайце—будзе весела. З'арганізуем.

Пішэце. Чакаю. Адрас на Уком.

Алёха.

Загінуў т. Апанскі.

Абставіны аварыі.

7-га чэрвеня ў 8 гадзін увечары між станцыямі Ждановічы і Менск здарылася аварыя дрызіны, на якой знаходзіўся, зьвяртаючыся з граніцы намесьнік паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ Беларускага Вайсковага вокругу т. Апанскі.

Тав. Апанскі і шофэр забіты. Цяжка ранен т. Федасенка.

Следзтва высьвятляе з дакладнасьцю, што загуба тав. Апанскага—справа контр-рэволюцыйнай рукі.

Следзтва працягваецца.

Язэп Казіміравіч Апанскі

(Кароткі жыцьцёпіс)

Тав. Апанскі Язэп Казіміравіч нарадзіўся ў 1897 годзе, у літоўскай сялянскай сям'і.

Яшчэ за некалькі гадоў да рэвалюцыі т. Апанскі пачынае прымаць актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. У 1916 годзе ён далучаецца да РСДРП (бальшавікоў), дзе адразу акунаецца ў практычную партыйную работу.

У Кастрычнікавыя дні Я. К. выконвае шэраг адказнейшых заданьняў Ленінградзкага і Цэнтральнага Камітэтаў партыі.

Пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі ён пераяжджае на працу ў Літву і Беларусь, дзе займае некалькі адказных партыйных і савецкіх пасад.

У 1920 годзе працуе некаторы тэрмін у Чырвонай арміі, пасьля чаго назначаецца намесьнікам паўнамоцнага прадстаўніка УЧК па Зах. краю.

З 1922 па 1924 год Язэп Казіміравіч працуе ў органах ДПУ розных мясцовасьцяй СССР.

У пачатку 1924 году ён зьвяртаецца ў Беларусь з назначэньнем на пасаду намесьніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Зах. краю, на якой і працуе да 7 чэрвеня--дню яго трагічнай сьмерці на баявой пасадзе.

Тав. Апанскі за увесь час сваёй работы ў БССР зьяўляўся членам ЦВК Беларусі і кандыдатам ЦК КПБ апошніх 2-х склікаў.

Комсамол! Рабоча-Сялянская Моладзь!

Памёр адзін з лепшых бальшавікоў Беларусі **т. Апанскі.**

Памёр таварыш, выконваўшы адну з адказнейшых работ у БССР **нам. Старшыні ДПУ БССР,** работу патрабуючую вялікай волі, працаздольнасьці, бальшавіцкай загартаванасьці.

Таварыш **Апанскі** ўяўляў у сабе усе гэтыя рысы, зьяўляўся сапраўдным сыном свае рабочае клясы, Камуністычнай партыі бальшавікоў.

Комсамол! Рабоча-Сялянская моладзь! Вучыся працаваць, будаваць соцыялізм, працягваць справу бальшавікоў!

ЦК ЛКСМБ і Менскі АК ЛКСМБ.

За тыраж!

Хто ня чытае газэты?

Некаторыя актывістыя нос дзяруць.

Пашырым падпіску!

Большасьць нашых тыповых **савецкіх** ячэек выпісвае ў вельмі малой колькасьці «Чырвоную Зьмену». Калі пацікавіцца прычынамі і высьветліць іх, то факты бываюць вельмі цікавыя.

Возьмем адну з гарадзкіх савецкіх ячэек: напрыклад **камунальнікаў.**

Ячэйка налічвае 40 чалавек, з іх «Чырвоную Зьмену» выпісваюць толькі—6 ч. Часткова гэта тлумачыцца тым, што 50 проц. складу ячэйкі зьяўляюцца прымацаванымі, ці беспрацоўнымі,--апошнія выпісваць газэты ня могуць.

Але хаця-б чыталі. Ніколі ня чытаюць; былі сходы, выносіліся пастановы, усё роўна гэта частка ячэйкі газэту чытае мала.

Другую палову ячэйкі складаюць працаўнікі цырулен, і калі вы зойдзеце ў цырульню, ды сустрэнеце комсамольца, то аб газэце ня пытайце,—адказ усё роўна будзе аднальковы---«мы «Чырвонай Зьмены» ня чытаем».

Бачыце ў цырульнікаў ёсьць такі закон, што ў цырульню выпісваюць толькі «Зьвезду» і пару якіх-небудзь часопісяй. Другіх газэт там ня сустрэнеш.

Чытае «Чырвоную Зьмену» і выпісвае **ў ячэйцы камунальнікаў** толькі актыў. Сярод актыву чутны добрыя і дрэнныя водгукі аб газэце. Адны хваляць і просяць пашырыць аддзел саюзных навін, наогул мясцовае жыцьцё, указваюць на недастатковую колькасьць тэлеграм на першай старонцы, другія адзначаюць добрае асьвятленьне кампаніі па зьніжэньню цэн. Па думцы некаторых таварышоў газэта павінна даваць больш кіруючага матар'ялу, прыстасаванага для актыву.

Возьмем другую профсаюзную ячэйку **—хэмікаў**

Ячэйка налічвае ўсяго 15 чалавек, аб'ядвае ў сваім складзе комсамольцаў Белшклотрэст і працколектыў.

Працуе ячэйка на яўрэйскай мове. Палова комсамольцаў выпісвае «Юнгэр Арбэйтэр», астатнія--«Чырвоную Зьмену».

Калі быў двухтыднёвік друку, ячэйка ня ставіла спэцыяльна пытаньня аб пашырэньні падпіскі на газэты. На сходзе ставіліся пытаньні агульныя: гісторыя «Праўды», аб друку і г. д.

Хэмікі адзначаюць неабходнасьць зьмяшчэньня ў большай колькасьці матар'ялаў з гарадзкога жыцьця, цікавага для гарадзкога комсамольца.

Ячэйка аб'яднанай профтэхшколы.

Комсамольцаў 100 чалавек, выпісваюць «Чырвоную Зьмену» 25 чал. з іх 18 трохмесячных падпісчыкаў.

Цікава тое, што калі ўпаўнаважаны па друку зьбіраў 3-хмесячных падпісчыкаў, шмат хто не хацеў падпісвацца толькі па тэй прычыне, што калі ўпаўнаважаны зьбярэ больш 45-ці падпісчыкаў, ён дармова паедзе ў Ленінград.

— Што, каб ты на мае грошы катаўся... Ня буду выпісваць!

І гэтак зрывалі падпіску.

Але ня гледзячы на гэткія адносіны «Чырвоную Зьмену» усё-ж такі чытаюць.

Абед. Палова школы прыходзіць з сталоўкі, адразу хапаюцца за «Зьмену».

У канцы абеду гаспадар газэты часта бярэ назад дзіравую газэту: як накінуцца—абавязкова парвуць. Ячэйка павінна паставіць задачу ўзмацніць падпіску на лета. Хлопцы жаляцца на адсутнасьць у апошні час матар'ялу з жыцьця рабочай моладзі.

На другіх пэдкурсах курсанты атрымоўваюць невялічкую стыпэндыю. Бюджэт строга абрэзаны. Тут і абед і чаравікі і кашуля. І ўсё-ж трэцяя частка ячэйкі газэту выпісвае.

Хто ня выпісвае, у перапынак біжыць у Ленінскі куток на некалькі хвілін, каб прагледзець «Чырвоную Зьмену».

АКА.

Трэба разварухнуцца

Зараз пытаньне з падпіскай на «Чырвоную Зьмену» павінна стаць у парадак дню кожнай ячэйкі. Мы гаворым **зараз** таму, што да гэтага часу, ні адна ячэйка ня можа пахваліцца, што ў яе гэта справа праходзіць здавальняюча.

Так, напрыклад, ячэйкі **Цягі, Руху і Шляху** Кастрычнікавага раёну нічога не зрабілі дзеля таго, каб падняць падпіску на газэту, у выніку чаго, «Чырвоную Зьмену» амаль ніхто ня выпісвае.

Юнсэкцыя клюбу Ільліча на МББ чыгунцы ня гледзячы на тое, што ў клюбе ёсьць 500 чалавек моладзі, не пастаралася каб у клюбе была «Чырвоная Зьмена».

У ячэйках гэта справа не кратаецца з месца. У піонэрскіх атрадах, дзе газэта павінна выпісвацца як кіруючы ворган комсамолу становішча з выпіскаю газэты дае такія лічбы: з 40 важатых раёну газэту выпісвае 4 чалавекі; **з 70 чалавек піонэраў-комсамольцаў газэты ня выпісвае ніхто.**

Ячэйка МШУ МББ пачала кампанію з падпіскай на газэту, але ў зьвязку з летам, як казаў сакратар, гэта справа заглухла.

Блакітны.

Ваюем з балотамі

Балотную твань ператворым у квітнеючыя нівы

На балотнай твані.

(Горацкі раён. Аршанская акруга).

У 1926 годзе ў вёсцы Наляшчыца ўтварылася мэліорацыйнае таварыства.

Гэта таварыства шчыра ўзялася за працу па асушцы балот.

І зараз ужо асушана 100 дзесяцін балота, якое будзе ў гэтым годзе засявацца.

Сяляне-сябры таварыства з радасьцю зазначаюць:—там дзе тапілася жывёла—будзем сеяць збажыну.

Цяпер сяляне ахотна ўступаюць у сябры таварыства. А таварыства рыхтуецца купляць трактар.

Г—ць.

На словах-суха, а на справе-мокра

(Вёска Слабада, Лагойскі раён, Менская акруга)

Наша вёска ў1924 годзе пракапала сваімі сіламі канаву, асушыла кавалак балота, за што атрымала прэмію.

Цяпер ахвота да далейшай працы па асушцы балот чамусьці адпала.

Комсамольцы толькі **на словах асушаюць балоты**, а на справе **не падтрымалі сялянскай думкі аб утварэньні сталага мэліорацыйнага таварыства.**

Бурбоўскі Пятрусь.

Торф—добры апал

Лясоў на Беларусі з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Апалу ўжо не хапае, як для насельніцтва, так і на патрэбы нашае прамысловасьці. Высякаецца лясоў больш, чым іх нарастае. Праз якіх-небудзь 10 гадоў Беларусь з лясной старонкі будзе бязьлесным стэпам. Дапусьціць гэтага ні ў якім разе нельга. Беларусь ня мае запасаў каменнага вугаля і нафты, і таму дрывяны апал мы можам замяніць толькі торфам.

Плошча торфяных балот на Беларусі раўняецца 400 тыс. дзес. Калі перавесьці гэта на сухі торф, то будзем мець 800 мільёнаў куб. саж. Столькі-ж мы маем зараз і драўніны. Але трэба прыняць пад увагу, што ня ўсе запасы торфу нам вядомы і іх будзе ў 1 з пол. разы больш, як мы думаем. Запасы торфу раскіданы па ўсёй Беларусі і ён ёсьць каля кожнае вёскі не далей 5—10 в.

Насельніцтва заўсёды можа здабываць торф на апал, які часамі бывае лепшы за дровы. Для таго, каб торф добра гарэў, трэба пад наглядам тэхніка асушыць і падрыхтаваць тарфяное балота.

Торф добра гарыць у галяндзкіх, рускіх і інш. печах, толькі полымя бывае трохі меншае. Калі-ж зрабіць у такіх печах паддувала, то торф будзе гарэць такім-жа полымем, як і дровы. Ніякага смуроду ў ежы ад таго што паляць торфам ня бывае. Але для таго, каб яго зусім ня было, трэба зачыняць коміны ў печы тады, як увесь вугаль дагарыць. Калі печ вельмі шчыльна зачыняецца дзьверцамі і праз іх ня можа прайсьці чад на хату, то можна, зачыніўшы дзьверцы, адначасна зачыніць і комін, нават калі вугалі і ня ўсе пагасьлі. Там, дзе ўсе прызвычаіліся да торфу, ні адна гаспадыня не пашкадуе, што паліць торфам, а не дрыўмі. Калі гаспадыня толькі пачынае паліць торфам, яна звычайна жаліцца на яго, але пасьля прывыкае і ўсё ідзе добра, бо добра прасушаны торф дае больш цяпла, чым дровы.

А. Іваноў.

Мэліорацыйныя

На болоце
Праца ў поце—
Там капаюць, тут сякуць.
Як-бы мошкі,
Ўсе патрошку—
Ў канавы правядуць.
Зазьвінелі
Заблішчэлі
Эх, лапаты, тапары!
Кіпіць сьмела
Наша дзела
Да вячэрняе пары.
Дзе ня станеш,
Дзе ня глянеш—
Ой, балотны відаць кут.
Калатушы
Ўсе асушым
Заквітнее ніва тут.
На гразіючы
Вада блішча,
Расьце траўка дзе нядзе.
Тут сталёвы—
Конь здаровы—
Трактар новы загудзе.
У ванючы
Дзе квятучы
Багун пахне ў гэты час,
Канюшына
Больш аршына
Аж пакруціцца у нас.

Зах. Бульбянік.

БУДЗЬ МЕТКІМ СТРАЛКОМ!

Абвяшчаецца ўсебеларускі стралковы конкурс.

Конкурс праводзіць „Чырвоная Зьмена" і ТСААвіяхім.

Хто можа прыняць удзел?

Газэта «Чырвоная Зьмена» і ЦС ТСААвіяхіму БССР праводзяць усебеларускі стралковы конкурс моладзі.

У конкурсе прымаюць удзел: стралковыя гурткі фабрык, заводаў, грамадзянскіх ВНУ, школ ІІ-ой ступені ці клюбаў. Гранічны ўзрост удзельнікаў **не старэй 25 год**. Кожны гурток выстаўляе неабмежаваную колькасьць стралкоў абодвага полу.

У конкурсе, разьлічаным на шырокія масы моладзі, ня прымаюць удзелу аддзяленьні таварыства «Дзінама», часьці РСЧА, сябры гурткоў знаходзячыхся на дзейсьцьвіцельнай ваеннай службе, стралкі, атрымаўшые калі-небудзь прызы на стралковых спаборніцтвах ня ніжэй губэрскага маштабу. Стралкі, ня ўдзельнічаючыя ў гуртках, да конкурсу не дапушчаюцца. Акруговыя аддзяленьні Саюзу паляўнічых прымаюць удзел у конкурсе на правох гурткоў.

Умовы спаборніцтва

Спаборніцтвы будуць праводзіцца з дробна-калібэрных вінтовак любога абразцу, але з адкрытым прыцэлам.

Адлегласьць—50 мэтраў. Становішча—любое з рукамі (без упору), патроны баявые любой маркі. Кожны мае тры пробных і дзесяць залікавых выстралаў. Разьмер мішэні: чорнае яблыка пасярэдзіне—6 сантымэтраў у дыямэтры (мішэнь № 6). Залікавые выстралы павінны быць зроблены ў працягу 10 хвілін. Права ўдзелу ў конкурсе маюць стралкі, выканаўшыя норму ў часе трэніроўкі ня менш 35 ачкоў з мала калібэрнай вінтоўкі з дыстанцыі 50 мэтраў з 10-ці выстралаў. Прызы прысуджаюцца калектывам і асобным стралком.

Запіс на конкурс

Стралковые гурткі, жадаючыя прымаць удзел ва ўсебеларускім конкурсе, запісваюцца ў мясцовым Савеце ТСААвіяхіму да 15 чэрвеня гэтага году. З 15 чэрвеня па 1-е жніўня гурткі праводзяць трэніроўку з мэтай выяўленьня стралкоў могучых прыняць удзел у конкурсе. З 1-га па 15 жніўня ўстанаўліваецца тэрмін правядзеньня на мясцох спаборніцтваў. Спаборніцтвы паладжваюцца па БССР адначасова пад кантролем судзейскіх калегій, вылучаных з складу АК ЛКСМБ, ТСААвіяхіму, АСФК, Акрпрофсаветаў, Акрсаветаў саюзу паляўнічых і зацікаўленых організацый на мясцох. Судзейскія калегіі пратакаліруюць конкурснае спаборніцтва на мясцох і пасылаюць афіцыйныя весткі ў Цэнтральную судзейскую калегію. Разгледзеўшы прысланыя матар'ялы, ЦСК завочна вызначае пераможнікаў і прысуджае прызы.

Склад Цэнтральнай Судзейскай Калегіі

Старшыня тав. Цімашэнка (Старшыня сэкцыі ВПТ), тав. Веражэйчык (ЦК ЛКСМБ), тав. Грыневіч (нам. старш. сэкцыі ВПТ), Крэмер (Ж. А. ЦК КП(б)Б), Смарчкоў (інструктар ВСФК), Конанаў (Культаддзел ЦСПСБ), Курцік (Рэдактар газ. «Чырвоная Зьмена), Данькоў (Старшыня ЦС Саюзу Паляўнічых).

За што будуць выдавацца прызы

Ацэнка па стралковаму конкурсу складаецца на падставе наступных даных:

1. Сярэдні вынік каманды па ачкох. Вынік атрымоўваецца ад дзяленьня сумы ачкоў усёй каманды на лік яе ўдзельнікаў.

2. Найбольшы процант уцягнутасьці моладзі ў стралковы гурток. Процант гэты азначаецца вылічэньнем адносіны колькасьці моладзі ў данны стралковы гурток да агульнай колькасьці моладзі на прадпрыемстве, фабрыцы, заводзе, пры якіх гурток організаваны.

3. Тэхнічная падрыхтоўка гуртка, азначаемая адносінай колькасьці ўдзельнікаў, выстаўленых даным гуртком, да агульнага ліку моладзі, якія зьяўляюцца сябрамі даннага стралковага гуртка.

Пераможнікамі ў індывідуальнай стральбе будуць лічыцца стралкі, выбіўшыя найбольшую суму ачкоў. Пры роўнай колькасьці выбітых ачкоў ацэнка стралка Цэнтральнай Судзейскай Калегіяй будзе адбывацца на падставе вучоту умоў у якіх стралок працуе і на падставе умоў працы гуртка, выставіўшага даннага стралка.

Форма № 1 сьпісаў запісу на конкурс

1. Назва прадпрыемства, установы, ВНУ, школы ці клюбу, пры якім лічыцца стралковы гурток.
2. Колькасьць сяброў гуртка з падзелам па полу.
3. Склад гуртка па соцыяльнаму складу (рабочых, сялян, служачых, вучняў).
4. Колькасьць у гуртку комсамольцаў.
5. Час узьнікненьня гуртка.
6. Колькасьць моладзі ў прадпрыемстве, установе, ВНУ, школе ці клюбе, пры якім знаходзіцца гурток.
7. Хто кіруе гуртком і тэхнічная падрыхтоўка кіраўніка.

УВАГА. Сьпіс завяраецца адказным сэкратаром Акруговага Савету ТСААвіяхіму.

Форма № 2 сьпісу для ўдзельнікаў спаборніцтва

1. Імя і прозьвішча. 2. Пол. 3. Узрост. 4. Якім гуртком выстаўлены. 5. Партыйнасьць. 5. Соцыяльнае становішча. 7. Як доўга займаецца стралковым спортам. 8. Колькі папаў куль. 9. Колькі выбіў ачкоў.

УВАГА. Пасьля правядзеньня спаборніцтваў запоўненыя сьпісы завяраюцца сябрамі судзейскіх колегій і высылаюцца ў ЦСК для азначэньня пераможнікаў і прызоў.

Прызы для гурткоў.

(Парадак разьмеркаваньня прызаў паказвае іх ступень).

1. Дробнакаліберная цяжкая вінтоўка «Гэкно» з прыцэльным варштатам.

2. Дробнакалібэрная цяжкая вінтоўка «Гэкко».

3. Дробнакалібэрная лёгкая вінтоўка «Гэкко».

4. Прыцэльны варштат.

5. Комплект літаратуры па вайсковай і стралковай справе.

6. Дробнакалібэрны рэвольвэр.

7. Прылада для стральбы шрацінкаю з рэвольвэру «Наган».

8. Поўны комплект прыладаў для стральбы шрацінкаю з трох лінейных вінтовак.

9. Выпіска на год часопісі «Военный вестник».

Індывідуальныя прызы.

1. Залаты жэтон.

2. Срэбраны жэтон з залатымі складанымі часткамі.

3. Срэбраны жэтон.

4. Дыплём.

УВАГА. Усе прызы саправаждаюцца выдачай стралковых грамат.

ТАРАС ГУШЧА

Гнілое балота

(Адрывак з апавяданьня „На прасторы жыцьця")

У той-жа вечар у хаце Кандрата Гугі адбыўся сход, склікаиы з прычыны прыезду Сьцёпкі. Сьцёпка сам праз Юрку паслаў запрашэньне Алёнцы. Сабралося многа хлопцаў і дзяўчат.

— Таварышы — зьвярнуўся Гуга да сходу:—да нас прыехаў наш таварыш і зямляк, Сьцяпан Барута. З намі ён прабудзе ўсё лета. У яго ёсьць плян работы, аб якім ён і даложыць нам.

У кароткіх і простых словах расказаў Сьцёпка сходу аб задачах экономічнага адраджэньня краіны, аб ролі рабочых і сялянства і у першую чаргу, аб ролі актыўнай моладзі ў гэтым экономічным будаўніцтве. Затым ён перашоў да свайго пляну. Па меры таго як выкладаў Сьцёпка свой плян, слухачы ўсё больш і больш захапляліся ім. І ня так вабіла і прыцягвала тая карысьць, што можа быць у выніку ажыцьцяўленьня Сьцёпкавага пляну, як самы размах і велічыня тае задачы, што ўставала перад імі. А калі далей Сьцёпка загаварыў аб організацыі «колектываў працы», аб іх задачах і дзейнасьці, то ўсе, як адзін, тут-жа пастанавілі скласьці такі колектыў.

— Да тут і старыя бабы запішуцца, калі прачуюць, што з Гнілога Балота можна сена сабраць,—заўважыла Марынка Пракапчук.

«Добры пачатак», думаў Сьцёпка.

Аленка чакала Сьцёпку, як яны і ўгаварыліся, на сьценцы каля Дзям'янавай клуні.

— Я сёньня-ж хацеў пабачыцца з табою, Аленка, і запрашэньне табе паслаў. Ну, пакажыся-ж, што ты за чалавек?

— Які ўжо там з мяне чалавек?—засаромілася Аленка.

І чалавек і дзяўчына ты адлічная,—паглядзеўшы на Аленку сказаў Сьцёпка.

— Я вельмі рада, калі гаворыш праўду.

— Ну, як жа твая падгатоўка.

— Слаба,--то тое, то другое замінае і часу малавата.

— А ведаеш, Аленка, што--можа-б ты ў пэдагогічны тэхнікум спрабавала-б? Так-бы ў канцы лета і паехала-б.

У Менск?

— Але. Падумаю. Справа там наладжана добра... Ёсьць сэнс.

-- А хіба ў тэхнікум! І сама я трохі думала аб ім.

-- Ну, як жа ты жывеш, Аленка?

-- А нічога. Як ты, Сьцёпка, пасталеў, проста хоць куды!

— А Шулевічу ты пісала?

— Не: буду я пісаць чорт ведае каму! Скажы, што ён за чалавек?

— Пустазвон і... дзяўчат зводзіць. І горш за ўсё—дзяўчаты яго любяць.

— А цябе хіба ня любяць?

— Сьцёпка ўздыхнуў, а потым сказаў:

— Я хацеў-бы, каб мяне пакахала... ну адна яна.

— Хто?—ціха спытала Аленка.

— Тая, каторую я пацалую.

Абняў Сьцёпка Аленку і пацалаваў.

— Дурны-ж ты: яна даўно, даўно цябе любіць.—І Аленка сама прыгарнулася да Сьцёпкі. Цалаваў яе Сьцёпка, а потым сказаў:

— Ты, Аленка, памятай: ніхто цябе так не палюбіць, як я. Адну цябе накахаў і больш нікога не хачу.

— Ты праўду кажаш?

— Каб не асушыць мне балота, калі я лгу,—пакляўся Сьцёпка.

— Цяпер я паверу табе,—засьмяялася Аленка:—які-ж ты мілы, дарагі, слаўны і сьмешны!

Слаўная была гэтая ноч, шкода толькі, што борзда сьвітаюць такія харошыя ночы.

XX

Яшчэ з ранку на другі дзень па Заборцах панеслася гутарка аб Сьцёпку. Адны казалі, што хлапец крануўся розуму, і гэта ёсьць божая кара за «сьвяты калодзеж». Такія гутаркі былі пушчаны бабкамі Агатаю і Таклюсяю. Другія, наадварот, казалі, што мазгі яго працуюць вельмі добра і што шмат якім бацьком не мешала-б мець такога сына.

А калі прашла чутка, што Сьцёпка задумаў асушыць гнілое балота, то зразу ня ведалі, што на гэта сказаць і якое даць тлумачэньне такому сьмеламу замаху. Адным словам, Сьцёпка зрабіўся цікавейшым чалавекам, якога яшчэ ня было ў Заборцах.

Пра ўсе гэтыя толкі даведаўся Сьцёпка, бо ў яго-ж тут былі і сапраўдныя прыяцелі. Усё гэта Сьцёпка ўзяў пад увагу і вечарам склікаў сход у школе. Ніколі ня было ў Заборцах такога многалюднага сходу. Сьцёпка гаварыў так проста і разумна, што яго слухалі з вялікай цікавасьцю. Канчаючы сваю прамову, ён сказаў:

— Я спадзяюся, шаноўныя дзядзькі--грамадзяне, што вы дапаможаце нам, маладым, сваім розумам і багатаю жыцьцёваю практыкаю, і грамадою мы ў два месяцы скончым гэтую работу.

— Бач, з якой павагаю гаворыць аб старэйшых,—таўкануў локцем свайго суседа Мікалай Зубнік.

— Так, гэта ён--маладзец!--адазваўся сусед Лукаш Гудач.

А калі пасьля Сьцёпкі слова ўзяў іх настаўнік Амельлян Пятровіч, усімі паважная асоба, і падтрымаў Сьцёпку па ўсіх пунктах, сказаўшы пра яго, як пра аднаго з самых лепшых сваіх вучняў, якім ён сьмела можа ганарыцца, то Сьцёпка яшчэ больш вырас у вачох сялян.

— Што-ж!?—У добры час.

— Паможам,--для сябе-ж, ні для каго.

Сьцёпка пакланіўся сходу.

— Я так і ведаў, шаноўныя дзядзькі, што вы дапаможаце нам.

Зашумелі, зазьвінелі маладымі галасамі і звонам рыдлевак Сухія Груды. 20 хлопцаў і 7 дзяўчат прышлі на работу. І работа закіпела адразу. Паставілі дзьве высокія тычкі з саламянымі мётламі каля рэчкі Міранкі, вызначылі месца, дзе павінен прайсьці канал, і правялі дзьве роўныя барознаачкі пад шнур на адлегласьці у сажань адна ад другой. Далёка тыя тычкі, чуць згледзіць зоркае маладое вока. Залацеюць на першых праменьнях сонца пяскі Сухіх Грудоў, сівым туманом атулілася Гнілое Балота, а старэнькі дубок, што за балотам, маўкліва стаіць і грэе на сонцы сваю лысую галаву дык пасьмейваецца. «А ну, паваюйце»,--як-бы падзадорвае моладзь. Трывожыцца Аленка «Ці здолееш ты, Сьцёпачка, да канца работу давесьці?» думае яна. А Сьцёпка сур'ёзны і спакойны парадак работы наладжвае, ад балота заставу пакідае, каб у канал вада не найшла, рабоце ня шкодзіла. Разьмеркавалі хлопцы работу сабе.

— Даеш два сажні на брата?---чуецца голас.

— Не гарачыся, таварышы!---спыняе Сьцёпка:---памалу, паволі возьмемся, каб не таміцца адразу---работы нам будзе. Канал тут, хлопцы, будзе глыбокі: тут самая высокая часьць груду, а далей пойдзе лягчэй.

— Пачынаем,—гукнуў Макар [illegible]

Зашорхалі рыдлёўкі ў зямлі, паляцелі кідкі направа і налева.

— Павальней, павальней, хлопчыкі!--стрымлівае Сьцёпка заўзятых таварышоў і сам марськае ў паветра зямлі. Расьце земляны вал, ніжэй у дол уваходзяць землякопы.

— Адпачні, хлопцы!--падае Сьцёпка каманду

Вылазяць маладыя работнікі, твары іх ад работы разгарэліся, весела жартамі перакідаюцца ў часе адпачынку.

Хлопцы-падлеткі прыбеглі. Пагледзелі на сьвежы вал, весела стала ім. Капаюць рыдлеўкі, у роў лезуць, капаюць, стараюцца.

— Вось нам і зьмена прышла,—кажуць старэйшыя хлопцы.

— Малайцы, хлопцы,—пахвальвае іх Сьцёпка:—вучыцеся гуртом працаваць. Акуратненька, браткі, капайце, вось як тут пачалі: зьверху шырока, а пад ніз вузей.

Старыя забораўцы—раскіданыя хмары пасьля навальніцы. Яны яшчэ не сталкаваліся, ні да якога пэўнага погляду ня прышлі. Адны ходзяць ды ў вус пасьміхаюцца: заядла штось адразу моладзь узялася, глядзі, каб на заўтра не астыла. Другія проста не даюць веры, каб можна было на работу столькі народу паставіць, а тыя патузаюць, патузаюць ды кінуць. Трэціх зайздрасьціць трохі і страх забірае, каб з посам не застацца. Чацьвертыя на вока прыкідаюць, колькі-б з гэтага Гнілога Балота можна сена сабраць. На адным толькі ўсе згадзіліся. Гнілое Балота прыцягала цяпер увагу кожнага з іх. Проста цікава было, што з гэтага выйдзе. Няўжо пасьля паўдня то той, то другі заверне пад Гнілое Балота хоць здалёк паглядзець, што там робіцца.

(Працяг у наступным нумары).

Працяг. Глядзі нумар 63 (445)

Падзяка комсамольскаму Ленінграду

Бюро ЦК ЛКСМБ на сваім апошнім пасяджэньні пастанавіла сумесна з рэдакцыяй „Чырвонай Зьмены“ зьвярнуцца з падзякай да Ленінградзкага Губкому УсеЛКСМ и рэдакцыі газэты „Смена“ за організацыю цёплага таварыскага спатканьня, за ўвагу і садзейнічаньне першай усебеларускай экскурсіі працоўнай моладзі

Цёмныя плямы нашага быту

Нарада замужніх комсамолак Віцебску

Нядаўна Віцебскі АК ЛКСМБ правёў па прыкладу рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ **нараду замужніх комсамолак.** На нарадзе быў заслуханы даклад аб выніках нарады замужніх комсамолак Менску і зачытан іх ліст.

Па лісту Менскіх комсамолак разгарнуліся вельмі ажыўленыя спрэчкі. Выявіўся шэраг цікавых фактаў становішча замужніх комсамолак. **Над імі часта сьмяюцца.** Цяжарных комсамолак ячэйкі не аслабаняюць ад працы і побач з гэтым **часта замужнім комсамолкам не даюць абавязкаў.** На сход, па думцы мужа, жонка не павінна ісьці. Назіраюцца **выхады з комсамолу па віне мужоў—комсамольцаў і партыйцаў.** Нават ёсьць выпадкі, калі **муж комсамолец б'е жонку.**

Нарада ў сваёй пастанове цалкам далучаецца да лісту Менскіх комсамолак і **лічыць патрэбным распрацоўку яго ў комсамольскіх ячэйках.**

Нарада зьвярнулася да акругкому з просьбай **распрацаваць пытаньне аб тыднёвых ясьлях.**

Акцябратам—практычныя навыкі.

ЦБ ЮП распрацавала і разаслала па акругах і раёнах матар'ялы аб **зьмесьце работы груп акцябрат.**

У аснову матар'ялаў кладзецца **набыцьце акцябратамі практычных навыкаў,** шляхам выкананьня імі шэрагу нескладаных заданьняў.

На Ўсесаюзную мастацкую выстаўку

Пры Інбелкульце адбылася нарада па пытаньню ўдзелу БССР ва ўсесаюзнай мастацкай выстаўцы, якая прыстасоўваецца да 10-ці годзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Нарада ўхваліла паслаць на выстаўку творы беларускіх мастакоў, беларускія кіно-фільмы, дэкорацыі і фотографічныя здымкі Беларускага і Яўрэйскага Дзяржаўных тэатраў і г. д.

Беспрацоўе сярод падросткаў

Па ўсіх акругах БССР мы маем на 1-е мая г. г. **4562 беспрацоўных падросткаў,** з якіх 40 процантаў дзяўчат і 60 процантаў хлапцоў.

За апошнія 7 месяцаў паслана на работу юнсэкцыямі акруговых бірж працы звыш **1200 юнакоў.**

Адна за аднэй...

Экскурсіі моладзі ў Менск.

Варта было рэдакцыі «Чырвонай Зьмены» і Менскаму Акругкому ЛКСМБ арганізаваць экскурсію ў Менск вучняў Вільшчанскай школы сялянскай моладзі, як пачалі адна за аднэй організоўвацца экскурсіі другімі ўстановамі.

У сераду, 8-га чэрвеня з Менску ўехала назад дамоў **экскурсія чэрвеньскіх комсамольцаў.** Усяго іх было 15 чалавек. З іх 11 рабочых падлеткаў.

Чэрвеньскія комсамольцы да паездкі шырока разгарнулі падрыхтоўчую працу. Аб экскурсіі ў Менск стаяла пытаньне на бюро ячэек, на агульных сходах і г. д.

Экскурсанты з Чэрвеня да Менску ішлі пяшком 11 гадзін. Пабылі на адчыненьні лягераў, дзе начавалі разам з чырвонаармейцамі сатаварыскага палка ў палатках.

Вялікае садзейнічаньне аказаў экскурсантам Ляхаўскі райком ЛКСМБ—шэф Чэрвеньскай організацыі комсамолу. За два дні свайго прабываньня ў Менску экскурсанты прабылі на заводах «Красная Заря» і «Энергия», у Дзяржаўным Музэі, у кіно і тэатры.

Такая-ж экскурсія была організавана **Зембінскай школай сялянскай моладзі,** вучні якой акрамя буйных менскіх заводаў і музэяў, азнаёміліся яшчэ з працай рэдакцыі «Чырвоная Зьмена».

У нядзелю 12-га чэрвеня ў Менск прыяжджае **экскурсія жодзінскіх комсамольцаў** у ліку 25 чалавек. Экскурсія прабудзе ў Менску 3 дні.

Пабачыць Менск

Менскі Акрполітасьвет наладжвае з 15 чэрвеня **шэраг сялянскіх экскурсій ў Менск.**

Сяляне-экскурсанты будуць знаёміцца з фабрыкамі і заводамі, сельска-гаспадарчым інстытутам імя Леніна, балотнай і агранамічнай станцыямі, культурнымі ўстановамі ды інш.

Па прыезьдзе ў горад сяляне будуць карыстацца дармовым памяшканьнем і гарбатай. Праезд—за кошт самых сялян і мясцовых організацый.

Колькі ў рэспубліцы рабочых?

У сучасны момант агульны лік рабочых у беларускай прамысловасьці складае **16.965 чалавек.** Бронь падросткаў у прамысловасьці ВСНГ налічваецца **1206 чал.,** што складае **звыш 7 проц.** у адносінах да агульнага ліку рабочых.

З гэтых бронь-падросткаў у шклянай прамысловасьці—545 чал. і дрэва-апрацовачнай—138 чал.

Зьвяжыся з кніжным кіоскам!

Усім райкомам і ячэйкам ЛКСМБ і піонэрскім атрадам

Выдавецтва ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена» выдае шэраг кніжок для комсамольскіх ячэек і піонэрскіх атрадаў.

Для прасоўваньня гэтай літаратуры ў вёскі скарыстоўваецца самы пашыраны апарат Бел. Аддз. Акцыянэрн. Т-ва «Книга деревне», які мае кніжныя кіоскі пры ўсіх паштовых аддзяленьнях і распаўсюджвае літаратуру таксама праз кальцавікоў і вясковых пісьманосьцаў. У зьвязку з тым, што паштовыя аддзяленьні ў нас існуюць амаль што ўсюды і кальцавая пошта праходзіць праз самыя далёкія вёскі, літаратура можа папасьці, такім чынам, ва ўсе куткі Беларусі.

ЦК ЛКСМБ і ЦБ ЮП прапануе ўсім ячэйкам ЛКСМБ і атрадам ЮП трымаць самую цесную сувязь з усімі кніжнымі кіоскамі на пошце, памагаць ім распаўсюджваць літаратуру, даваць рэкамэндальныя сьпісы на неабходную літаратуру.

Усім ячэйкам і атрадам неабходна праводзіць сталую работу сярод сялянства, моладзі, дзяцей за закупку выдаваемай літаратуры, як індывідуальна, так і калектыўна (піонэр-атрады і ячэйкі), свае часова апавяшчаючы ў клюбах і на сходах назвы выдаваемых кніжок, іх карысьці, скарыстоўваючы для гэтага водзывы па газэце «Чырвоная Зьмена» і часопісе «Беларускі Піонэр».

Ячэйкі і атрады павінны паставіць справу распаўсюджваньня комсамольскай і дзіцячай літаратуры ў плян сваёй работы, побач з іншымі пытаньнямі комсамольскай работы.

Сакратар ЦК ЛКСМБ **Бараньнікаў.**

Заг. Бел. Аддз. Акц. Т-ва «Книга деревне» **Пайкін.**

Старшыня ЦБ ЮП **М. Адзінец.**

Фізкультура.

Усебеларускае сьвята.

З 15-га па 25-е жніўня ў Гомелі праводзіцца **ўсебеларускае сьвята фізкультуры.**

Програма сьвята наступная: спаборніцтвы з сямібор'ем для мужчын і пяцібор'ем для жанчын, спаборніцтвы па ўсім відам спорту, культывіруемым у БССР, розыгрыш першынства па футболу і баскетболу і фінальныя матчы.

Кожная акруга насылае на сьвята па 10 фізкультурнікаў, з якіх 5 мужчын і 5 жанчын

Якім павінен быць інструктар фізкультуры

ВСФК зацьвердзіў проэкт **палажэньня аб інструктарах фізкультуры,** які ўносіцца на зацьвярджаньне ЦСПСЬ.

Проэкт устанаўлівае 3 разрады інструктароў фізкультуры, якія вызначаюцца па наступным прызнакам: аб'ёму курсу спэцыяльнай падрыхтоўкі, стажу работы і фармальных ведаў, выяўляемых кваліфікацыйнай камісіяй савету фізкультуры.

Інструктары першага разраду маюць права выкладаньня фізкультуры ў тэхнікумах, ВНУ, на рабфаках і курсах; інструктары другога разраду—у профшколах, сямігодках і піонэратрадах; **інструктары-ж трэцяга разраду дапушчаюцца да выкладаньня фізкультуры** толькі з санкцыі СФК.

Абавязкамі **інструктара ФК зьяўляюцца:** рэгулярнае правядзеньне **заняткаў з членамі** спортгуртка па програме СФК, удзел ва ўсіх пасяджэньнях бюро і агульных **сходах гуртка,** нагляд за **ажыцьцяўленьнем** мэдыцынскага кантролю ў гуртку, непасрэдны ўдзел у організацыі масавых фізкультурных мерапрыемстваў у клюбе ці саюзе, пры якім існуе фізкультгурток.

Акруговыя спаборніцтвы.

Менскі акруговы савет фізкультуры намеціў правесьці гэтым **летам акруговыя спартыўныя спаборніцтвы.**

З 23-га ліпеня па 1-е жніўня будуць адбывацца міжведамсьцьвеныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічаюць фізкультурнікі ваенведу, профсаюзаў і клюбаў.

З 1-га па 3-е жніўня адбываюцца спаборніцтвы паміж усімі раёнамі Менскай акругі.

У акруговых спаборніцтвах, якія ладзяцца з 3-га па 8-е жніўня, будуць удзельнічаць пераможцы міжведамсьцьвеных і раённых спаборніцтваў.

„Сьвятыя цуды“ ў 5 хвілін

Матар'ял для вячорак і клюбных вечароў

Як з вады зрабіць малако?

Бяруцца дзьве шклянкі. У адну з іх налівэецца расчын звычайнай паваранай (сталовай) солі, а ў другі расчын—ляпісу. Абодвы гэтыя расчыны зусім празрысты, але будучы зьмешаны, даюць белы густы асадак, які каб не асядаў на дно, трэба памешваць палачкай. Пасьля таго, як вопыт будзе паказаным, трэба шклянку з зьмесьсю паставіць за стол, каб яго нельга было бачыць, бо зьмесь пачне асядаць на дно.

Як з вады зрабіць кроў?

Гэты вопыт можа праводзіць дваяка.

1. Узяць дзьве шклянкі і ў адну з іх наліць да палавіны вады, у якой расчыніць крыху **раданістага калія,** а ў другую—таксама вады, у якую капнуць некалькі капляў хлёрыстага зялеза; расчыняць тое і другое трэба пакрысе, каб было відаць ахварбоўкі. Калі гэтыя расчыны зьліць разам, то атрымаецца ярка ахварбованая чырвоная жыжка, падобная на кроў.

2. Інакш можна наставіць вопыт наступным чынам: наліць у шклянку расчыну хлёрнага зялеза настолькі слабага, каб ахварбоўка яго была амаль ня прыкметнай, а маленькі крысталік **раданістага калія** ўсунуць у канец шкляной трубкі (загадзя падрыхтаванай).

Сказаўшы некалькі слоў аб гэтым «цудзе» можна прыступіць да выкананьня вопыту. Для гэтага трэба толькі памяшаць падрыхтаванай палачкай (яе для жартаўлівасьці можна назваць магічнай), як зараз-жа раданісты калій пачне расчыняцца і пры хуткім разьмешваньні ўся жыжжа ахварбуецца у густую чырвоную матэрыю.

Золата з вады

Для гэтага вопыту трэба загадзя падрыхтаваць сьвінцовай прымочкі. Яна робіцца наступным чынам. Купіць у аптэцы ці у аптэкарскім магазыне вуксусна-кіслага сьвінца; палову чайнай лыжкі яго расчыніць у шклянцы вады (пры чым трэба мець на ўвазе, што увесь парашок не расчыніцца); калі дадаць да яго 5—10 капель вуксуснай эсэнцыі ці крыху вуксуса, дык расчын зробіцца празрысьцей.

Потым трэба асобна расчыніць у паўшклянцы вады палову чайнай лыжкі едзістага калія (прадаецца у аптэках і аптэкарскіх магазынах). Гэтыя два расчыны павінны быць выстаўлены загадзя на стале прад пачаткам вопытаў.

Калі зьліць разам едзісты калій з сьвінцовай прымочкай, то утворыцца жоўтая муць, яна расчыняецца пры награваньні зьмесі на агні (каб пасуда, у якой будзе рабіцца награваньне, ня лопнула, трэба ўзяць для награваньня хэмічную шклянку з тонкага шкла). Калі жыжка заварыцца, ёй трэба даць паварыцца 2—3 мінуты, памешваючы палачкай.

Пасьля таго, як пры варэньні жоўты асадак увесь расчыніцца, трэба пакінуць гэтую жыжку астываць. Мінут праз 20—30, калі жыжка досыць астыне, у ёй пачнуць зьяўляцца маленькія залацістыя лісточкі.

Гэта, зразумела, ня золата. Гэта—ёдзісты сьвінец—злучэньне ёду са сьвінцом, матэрыя залаціста жоўтага колеру, якая атрымалася з вуксусна-кіслага сьвінца і ёдзістага калія.

Крывое люстра

Выканаў абяцаньне!

На старонках „Чырвонай Зьмены“ ўжо пісалася аб тым, як комсамолец ячэйкі працмастацтва кіно-мэханік т. **Левін,** ня гледзячы на тое, што ён зьяўляўся сябрам мясцкому Белдзяржкіно, учыніў над старым і паважаным працаўніком кіно вялікую абразу, прыклеіўшы на яго інструмант верш хуліганскага зьместу.

Выкліканы на бюро, Левін абяцаў усім зрабіць **„штучку яшчэ лепш“.**

І вось нядаўна, калі таварыства **„Прэч няпісьменнасьць“** наладзіла ў кіно **„Чырвоная Зорка“** кіно-сэанс на карысьць таварыства, Левін убачыў, што тут ён можа выканаць свае абяцаньне і выкінуць **„штучку“.**

Застракатаў апарат. Замільгацела кіностужка.

У гэты самы момант у будку увашоў прадстаўнік таварыства „П. Н.“

Левін, міргнуўшы вокам старэйшаму мэханіку, пачаў выкідываць „штучку“:

— Паважаны прадстаўнік „ПН“—пачаў **Левін—будзьце ласкавы заплаціце нам зараз за нашу працу 25 рублёў.**

Прадстаўніку таварыства стала млосна. Кіно-сеанс даў зусім невялікі збор і вось добрую долю гэтых грошай хоча забраць кіно-мэханік у той час, як яму прычытаецца ўсяго 4 рублі!

— Я ня дам 25 рублёў—сказаў ён.

— Не дасьцё—адказаў спакойна Левін добра, тады я даю загад выключыць апарат!

Сказана—зроблена.

Экран згас

Левін вышаў з апаратнай з задаволенай ухмылкай на вуснах, а за ім бег, ламаючы рукі, організатар сэансу... Дарэмна абурана гудзела публіка, дарэмна несьліся крыкі аб прапягу сэансу! Левін паказаў сябе сапраўдным „цьвёрдакаменным“ і гаспадаром свайго слова!

* *

Бюро ячэйкі працмастацтва пастанавіла **даць яму строгую вымову, прасіць адміністрацыю перавесьці Левіна з кіно „Чырвоная Зорка“, дзе на яго маюць уплыў беспартыйныя майстры, у другое кіно і зьняць з працы прадстаўніка ячэйкі КСМ у мясцкоме.**

Чычэ.

У тры радкі

▣ Гэтымі днямі ЦК МОПР'у у БССР пераведзе **30 тысяч рублёў на карысьць політзьняволеных Заходняй Беларусі.**

▣ За апошні час з БССР **перасяліліся у Крым** дзеля заняткаў земляробствам **750 яўрэйскіх сем'яў.**

▣ Беларусі прадастаўлена **17 месцаў у індустрыяльныя, пэдагогічныя, сельска-гаспадарчыя і іншыя ВНУ Украіны.**

▣ Яўрэйская комсамольская газэта **«Юнгер Арбэйтэр»** праводзіць зараз на сваіх старонках кампанію **барацьбы з клерыкалізмам.**

▣ Белдзяржвыдавецтва рыхтуе да друку **зборнік навейшай украінскай літаратуры, дзе будуць зьмешчаны, выбраныя творы выдатных украінскіх поэтаў і пісьменьнікаў.**

▣ Колькасьць сялянскіх гаспадарак у БССР дасягае 690.479. На кожную гаспадарку прыпадае ў **сярэднім каля 8 дзесяцін зямлі.**

▣ Менскі Акруговы Выканаўчы Камітэт абвясьціў **конкурс на лепшы проэкт пабудовы гарадзкога трамваю.**

▣ Акруговыя саветы ТСААвіяхіму БССР распачалі **прыём заяў ад жадаючых паступіць у вайсковыя школы лётчыкаў. Усяго з БССР будуць прыняты ў авіа-школы 50 чалавек.**

▣ Саўнарком адпусьціў **10 тысяч рублёў на агранамічныя і культурныя патрэбы колектыўных гаспадарак Беларусі.**

▣ Згодна пастановы Наркамасьветы, выпускнікі сямігадовых школ **будуць сёлета прымацца бяз іспытаў ва ўсе тэхнікумы БССР.**

Школа на Доўгабродзкай

Уначы на 7-е чэрвеня любімец Менскага Крымінальнага Вышуку — сабака „Хузан“ быў устрывожаны. Ён тэрмінова быў выклікан з свайй кватэры—пітомніка па Доўгабродзкай, 25, у галоўміліцыю... Там „Хузан“ атрымаў заданьне: раскрыць кражу.



Бар'ер, «Хузан», бар'ер!

Трое—„Хузан“, яго дрэсіроўшчык і агэнт—накіраваліся ў дарогу. Справа была важная.

Спачатку ўсё спрыяла таму, каб прадпрыемства закончылася ўдала: цішыня заснуўшага гораду, халадок, рэдкія прахожыя... „Хузан“ хутка бег наперад, апусьціўшы вострую морду. Але раптам па асфальту застукаў дождж. Цёплыя вясеньнія патокі абмылі тратуары—зьнішчылі сьляды. „Хузан“ быў бясьсілен. Ён рваўся з ланцужка, кідаўся ва ўсе бакі, але дождж не пераставаў залiваць горад... Прадпрыемства было сарвана: злодзей зьнік.

Але такія няўдачы не заўсёды бываюць у практыцы нашага крымінальнага вышуку. Часта сабакі-ішчэйкі выкрываюць месца знаходжаньня злачынцаў. Нядарма яны прайшлі цяжкую, сур'ёзную школу!

Цэнтральны сабачы пітомнік займае пустыр, абведзены высокім плотам. Унутры пустыру—драбіна, кухня, леднік і бар'еры. Калі я ўвайшоў сюды, дык убачыў як некалькі дзясяткаў нямецкіх аўчарак, доберман-пінчэраў і маленькіх шчанят кідаліся на дротавыя дзьверы сваіх клетак з мэтай расчыніць іх.

„Хузан“ моцнымі лапамі рваў дрот. Над дзьвярыма клеткі дрыжэла маленькая шыльдачка—кароценькая біографія сабакі. Тут былі пералічаны бацькі, дзяды і прадзеды „Хузана“. Такія шыльдачкі—над кожнай клеткай.

Першым са мною пазнаёмілі „Хузана“. Дрэсіроўшчык папрасіў мяне схаваць якую небудзь рэч. Я пашукаў у кішэні —намацаў блёк-нот. Адышоў у бок і схаваў блёк-нот у высокай траве... Закрыў лапухом, закідаў рознай дробязьзю, потым абагнуў пустыр, з паловы дарогі вярнуўся на свой сьлед, узьлез на драбіну—усе, каб як небудзь зьбіць сабаку з толку... Прытаіўся і чакаю.

Дрэсіроўшчык скінуў ашейнік:

— Хузан, сьлед! Сьлед!

Сабака кінуўся па сьляду, пакружыўся і вярнуўся да дрэсіроўшчыка.

— „Хузан“: яшчэ раз сьлед! Сьлед! Цішэй.

„Хузан“ зноў кінуўся, зьнік у траве і праз хвілінку я трымаў свой блёк-нот у руках з двума вострымі ўдавінамі ад зубоў на пераплёце.

— Цяпер глядзіце ўважліва—сказаў дрэсіроўшчык і адышоў у другі бок пустыру.

„Хузан“ разумнымі вачыма сачыць за дрэсіроўшчыкам: той крыкнуў—і „Хузан“ забрахаў; той махнуў рукой—і „Хузан“ сеў; той падняў руку—і „Хузан“ пабег; той загадаў паўзьці—і сабака, сьмешна адкідваючы зад, па поўз па жываце.

— Бар'ер, „Хузан“, бар'ер!

Я не пасьпеў агледзецца, як над бар'ерам вышынёю ў два метры мільганулі лапы „Хузана“. Потым ён хутка прабег па драбіне.

— Маладзец, „Хузанчык“! Дрэсіроўшчык пяшчотна гладзіў сабаку па вострай вушчынай мордзе і стаячым вушам. Бліскучыя, удзячныя вочы адказваюць яму.

„Хузану“—тры гады. Ён з найвыдатнейшых. Апрача яго лепшымі сабакамі лічацца „Гарас“ і „Цігра“. Яны штодзённа працуюць.

Ня лёгка абучаць гэткіх „Хузанаў“ і „Гарасаў“ усім мудрым штукам.

Пачынаюць з самага звычайнага—маленькіх шчанят водзяць на ланцужку, упарта, хоць і павольна, муштруюць. Трэба, каб дрэсіроўшчык абучаў так, каб сабачка праз некаторы час ужо з ахвотай і радасьцю ішла на ланцужку. Калі гэта не ўдаецца—усё прапала. Галоўная зброя ў выхаваньні сабак—**пяшчота ласка.** Праз месяц сабаку ўжо можна абучаць розным прыёмам. На кожны прыём у сярэднім уходзіць тыдзень. Напрыклад, для таго, каб прывучыць сабаку класьціся на зямлю, трэба кожны дзень на хвілін 15 з перапынкамі браць у левую руку павадок, у правую—лапы і прыжымаць да зямлі са словамі:

— Кладзіся, кладзіся, кладзіся...

Ці вось—скачкі праз бар'ер. Спачатку сабака пераскаквае разам з дрэсіроўшчыкам толькі праз адну дошку, потым праз дзьве і г. д. Каб навучыць сабаку лезьці на драбіну, трэба ў працягу тыдню кожны дзень перабіраць сабаку лапы па палачкам, лезьці самому і г. д. Колькі тут патрэбна ўпартасьці і д'ябальскага цярпеньня!

Сабак вучаць кожны дзень. часта водзяць у лес, робяць „сьлед“ н 5-6 вёрст...



Па сьляду...

Усе дрэсіроўшчыкі маюць асобую „спэцадзежу“. Партки і кашуля ў іх заўсёды набіты кудзельлю, каб у няшчасным выпадку ўкус ня быў моцны.

Усе сабакі пітомніку маюць салідны „стаж“. У актах крымінальнага вышуку адзначаюцца іх дасягненьні, іх перамогі. Напрыклад, „Гарас“ аднойчы разузнаў сярод чатырох чалавек сапраўднага вінавайцу, што ніяк не маглі зрабіць агэнты. „Цігра“ ня раз вандравала па чардаках, адшукваючы людзей, пакраўшых бялізну...

Сябры пріемніку па Доўгабродзкай—верныя памочнікі нашай міліцыі. І імі гардзяцца.

А. Каліта.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.